# Біблейскія прыпавесці і святло любові

***18 сакавіка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пры падтрымцы Польскага Інстытута ў Мінску адкрылася экспазіцыя працаў па выніках мастацкага пленэра сучаснага іканапісу ў цэнтры Брацтва грэка-каталіцкай моладзі ў польскіх Навіцах.***

Пленэры ладзяцца з 2009 г. і кожны год маюць пэўную біблейскую тэматыку. Летась тэмаю былі абраныя прыпавесці Старога і Новага Запаветаў. У прадстаўленых на выстаўцы творах мастакоў розных традыцыяў і школаў з Польшчы, Грузіі, Украіны, Беларусі, Літвы мастацкімі сродкамі пераказаныя эпізоды прыпавесцяў у сучасным прачытанні.

22 сакавіка прадставіў сваю чарговую выстаўку «Святло любові Тваёй» жывапісец Генадзь Сухамлінаў. Творчую працу за мальбертам мастак сумяшчае з педагагічнай дзейнасцю ў Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжы мастацтваў, дзе цягам чатырох дзесяцігоддзяў выкладае і за што адзначаны ганаровым знакам Міністэрства адукацыі Беларусі. Творца лічыць сябе хрысціянскім мастаком, супрацоўнічае з Цэнтрам духоўнай асветы і сацыяльнага служэння Беларускага Экзархата, абраны акадэмікам Міжнароднай Кірыла-Мяфодзіеўскай акадэміі славянскай асветы. За сваю хрысціянска-асветную дзейнасць узнагароджаны медалём Свяціцеля Кірылы Тураўскага.



*Г. Сухамлінаў*



*Точа КАКАБАДЗЭ (Грузія), Хрыстос распавядае прыпавесці*

У экспазіцыю ўвайшлі працятыя святлом хрысціянскай любові трыпціхі «Падзяка», «Вяртанне», «Прасвятная зямля», працы «Анёл», «Божы дарунак», «Нараджэнне храма», а таксама беларускія краявіды і замалёўкі вясковага жыцця ды інш.

Адкрыццё выстаўкі выклікала надзвычайную цікавасць. Зала ледзь змясціла ўсіх удзельнікаў і прыхільнікаў творчасці Г. Сухамлінава. Разам з вернікамі мінскага прыхода ў імя Св. Сафіі Слуцкай прысутнічаў і выступіў з прывітальным словам айцец Анатоль.

Апошні дзень працы выстаўкі – 9 красавіка.

*Наш кар. Фота Наталі КУПРЭВІЧ*